# Байкі Локі*

## Сяргей Шыдлоўскі
## пасьляслоўе

Бажок Локі — скандынаўскі прадстаўнік у інтэрнацыянале трыкстэраў. Гэтаму прыкольнаму чуваку з ф'ёрдаў ад старажытных вараскіх часоў і нашыя землі не чужыя.

Нашыя землі, уласна, — землі яго, царства трыкстэра. Хто такі Дзёмка-селянін, Несьцерка ці дамавікі Адама Глёбуса як не інкарнацыя Локі, — жартаўнікі-правакатары, "інтэлект без адказнасьці".

Пры тым што Севярын Квяткоўскі выглядае большым Локі, чым сам Локі, на старонках "Фрашак" паўсталі ня дробныя дэманы, а людзі. Нашыя людзі, пра якіх гаворыцца з гумарам, але па-харошаму і нават цёпла. Больш за ўсё аўтар цьвеліць над сабой, што рэдкасьць

* Локі — адзін са скандынаўскіх міталягічных багоў. Спрытны вынаходлівы хітрун. Для яго адсутнічаюць панятккі "ілжывасьць" і "праўдзівасьць". Локі — адзін з боствав-трыкстэраў, якія парушаюць парадкі багоў і законы прыроды, але пры тым, зазвычай, неасэнсавана дасягаюць якога-кольвек пазытыўнага эфэкту.

для генэрацыі 30-гадовых прыпозьненых беларускіх постмадэрністых.

Побач зь іншымі азначэньнямі, кшталту “The Bestseller”, я б надпісаў на вокладцы гэтай кнігі таксама “Friendly”, — у “Фрашках” адсутнічае патас, зьнелюбеласьць, пагарда і разьлік. Квяткоўскі быў у віры моладзевых акцыяў супраціву сярэдзіны 1990-х, але і для міліцыянтаў у кнізе знаходзіцца добрае слова. Няма літасьці адно бэпээсэмаўцам.

Прычына памяркоўнага тону кнігі ў нацыянальнай беларускай талерантнасьці? Мяркую, тут нешта іншае. Магчыма, дух беларушчыны пачатку 1990-х, сьвяточны і карнавальны, калі да нацыяналізму чатырнаццаці-васямнаццацігадовая прыходзілі на ўздыме Руху. Усё Толькі Пачыналася. Гэта былі першыя хвіліны, гадзіны, ночы і дні Незалежнасьці. Так, мы выдумлялі для Беларусі герб, ня ведаючы, што ён існуе, вымалёўвалі абрысы радзімы на контурных школьных мапах — у этнічных межах. Яе грамадзянамі мы зьяўляліся задоўга да таго, як атрымалі пашпарты з Пагоняй. Мяркую, ёсьць заканамерным, што гэты час знайшоў свайго летапісца ў асобе Квяткоўскага. Яму стае пазытыву і прынцыповасьці, каб адэкватна адлюстраваць атмасфэру 1990-х.

Навучка гісторыка даецца ў знакі — з “Фрашкамі” кантрабандай пад выглядам бяседных показак мы займелі адмысловае антрапалягічнае дасьледаваньне.

Ступень посьпеху, свабоды, самарэалізацыі (творчай, эканамічнай, нацыянальнай)

кожны вызначае сабе сам. Прыкрая і няўтульная праўда. Для яе спавяданьня мы пакідаем пакуль адно “закуткі паралельнай прасторы”. Яны ёсьць і ў “нашых” і ў “калдыроў”, у “казакоў” і ў “разбойнікаў”. Магчыма, мы не перасякаемся ў часе, але мясьціны для душэўнага адхланьня ў нас адны і тыя ж.

KAMUNIKAT.org